Ігар Данільчык,
іерэй Барыса-Глебскай (Каложскай) царквы г. Гродна

Р. І. Тарарака,
настаўніца гімназіі № 7 г. Гродна

Мова і асоба: развагі школьнага настаўніка

У пачатку было Слова, і Слова было ў Бога,і Богам было Слова. Яно было ў пачатку ў Бога; усё праз Яго пачало быць, і без Яго нішто не пачало быць,што пачало быць. У Ім было жыццё, і жыццё было святлом для людзей.

Евангелле паводле Іаанна, 1:1–4.

Як вядома, грамадства – гэта найперш сукупнасць разнастайных формаў сумеснага існавання і дзейнасці людзей. Грамадскае суіснаванне ажыццяўляецца праз дзейнасць, а таксама праз мову, якая з'яўляецца сродкам сацыяльнага быцця чалавека-суразмоўніка, пазнання свету, мыслення і г. д. Мова суправаджае свядомую дзейнасць асобы на працягу ўсяго жыцця і становіцца асноўным яе атрыбутам. Менавіта выключнасцю функцыі мовы ў лёсе індывіда і тлумачыцца той факт, што мове вучаць ад нараджэння: спачатку праз суразмоўніцтва з дарослымі і равеснікамі, а потым – у працэсе арганізаванай і мэтанакіраванай адукацыі.

Мова – гэта з аднаго боку сховішча культуры, у якім закадзіравана ўся інфармацыя пра чалавецтва, а з другога боку – адзіная крыніца яе (культуры) пазнання, узбагачэння і развіцця. Пазнанне культуры адбываецца ў працэсе арганізацыі пазнавальнай дзейнасці, якая, у сваю чаргу, не можа існаваць інакш, як праз мову. Мова з'яўляецца асноўным сродкам запамінання, захавання і ўзнаўлення інфармацыі. Любыя звесткі пра навакольны свет захоўваюцца ў памяці чалавека часцей за ўсё ў выглядзе вобразаў і слоў. Зрокавая памяць звязана са зрокавым успрыняццем інфармацыі, слыхавая – са слыхавым. Любая тэкставая інфармацыя – зрокавая ці слыхавая – захоўваецца ў памяці і аднаўляецца праз слова, праз мову.

Такім чынам, мове належыць выключная роля ў наладжванні супольнай дзейнасці грамадства, фарміраванні яго трываласці, духоўнай маналітнасці. Яна – самы магутны акумулятар інтэлектуальных і духоўных здабыткаў чалавецтва, зберагальніца ўсяго папярэдняга яго

вопыту. А гэта значыць, што яна выступае не толькі сродкам зносін паміж людзьмі. Мова з'яўляецца для іх сувязніком з мінулым і будучыняй, з Сусветам і Прыродаю, з іх духоўна-энергетычным патэнцыялам. Калі мова грунтоўна выяўляе прыродную сутнасць аб'ектаў і рэчаў, працэсаў і з'яў, разнастайна перадае іх, то набывае незвычайную моц і велічнасць. Уздзеянне шматкроць павялічваецца, калі авалоданне родным словам адбываецца натуральным чынам у суладных зносінах з навакольным асяродкам. Дадзеная народу Богам і ўдасканаленая людзьмі, прыстасаваная імі да канкрэтных ландшафтных і культурна-гістарычных умоваў, мова актуальна ўплывае на духоўны стан грамадства, дапамагае чалавеку стаць АСОБАЮ.

Слова, як і творы культуры, утрымлівае духоўна-інтэлектуальную энергію, успрынятую людзьмі ў навакольнай прасторы і апрацаваную імі. Праз Слова перадаецца яна ад папярэднікаў да наступнікаў і пашыраецца сярод сучаснікаў. Слоўная энергія ўздзейнічае не толькі на інтэлект людзей, але і на іх душы, фарміруе іх сумленне. Узмоцненая музычнай ці мастацкай энергіяй, яна здольная дакранацца да жывых тканак душы і натхняць іх.

Штодзённа вучням патрабуецца сілкаванне духоўнай энергіяй. Гэта і непасрэдны кантакт у прыродным асяродку, успрыманне яго хараства, і сустрэча з творамі культуры, і слоўны практыкум. Слова – гэта адлюстраванне рэальнасці (у дакументальным ці мастацкім, канкрэтным ці абагульненым выглядзе). Чым багацейшы слоўнікавы запас школьнікаў, тым больш панарамнае і аб'ёмнае спазнанне імі рэчаіснасці, тым больш моцная суладнасць з наваколлем, Сусветам, тым больш плённае творчае выяўленне. Засвоенае роднае слова станоўча праграмуе чалавека, адпаведна і грамадства, робіцца адметнай натхняльнай сілай для іх.

Чалавек – найлепшае тварэнне Госпада, створанае паводле вобраза і падабенства Божага. Гэта значыць, што кожны чалавек атрымаў у спадчыну ад свайго творцы тыя рысы, якія вылучаюць яго з усяго жывёльнага свету: розум, дар слова і свабоду волевыяўлення. Адно з галоўных адрозненняў чалавека ад жывёл – членараздзельная мова. Але часам гэта «славесная адметнасць», што ўзвышае чалавека да найвышэйшага зямнога стварэння, адоранага розумам і сумленнем, зводзіць чалавека да ўзроўню жывёлы, дзікага звера. А віной усяму нявінная дробязь – язык. Апостал Іакаў на старонках Святога Пісання наступным чынам разважае пра тое, як мы карыстаемся гэтым органам нашага цела і адзначае: «Калі хто словам не грашыць, той чалавек дасканалы, які можа ўтаймаваць усё цела сваё. Калі акілзваем коней, каб

слухаліся нас, то падпарадкоўваем усё іх цела. Вось і караблі, хоць такія вялікія яны і магутныя вятры іх носяць, а кіруюцца маленькім стырном туды, куды стырнавы захоча. Так і язык, хоць і малая частка цела, але многа робіць. Вось такі маленькі агеньчык, а вялікі лес падпальвае. І язык – гэта агонь, асяродак усякай злачыннасці. Язык так змешчаны паміж нашых членаў, што запальвае ўсё цела ды, сам запалены пякельным агнём, запальвае кола жыцця. Бо ўсякая прырода звяроў і птушак, паўзуноў і марскіх жывёл утаймоўваецца і ўтаймавана прыродаю чалавечай. Языка ж утаймаваць ніхто з людзей не можа; і гэта несупыннае зло, поўнае смертаноснай атруты. Ім бласлаўляем Бога і Айца, і ім жа праклінаем людзей, якія створаны на падабенства Божае. З тых самых вуснаў сыходзяць блаславенне і праклён. Не павінна так быць, браты мае! Хіба цячэ з адной крыніцы салодкая і горкая вада? Не можа, браты мае, смакоўніца радзіць масліны альбо вінаградная лаза смоквы; гэтаксама і адна крыніца не можа даваць салёную і салодкую ваду» (Пасланне святога апостала Іакава, 3:2–12).

Згодна з Бібліяй, нам давядзецца трымаць адказ за кожнае вымаўленае слова: «Добры чалавек з добрай скарбніцы выносіць добрае, а ліхі чалавек з ліхой скарбніцы выносіць ліхое. Кажу ж вам,што за кожнае марнае слова, якое вымавяць людзі, дадуць яны адказ у дзень судны: бо паводле слоў сваіх апраўдаешся і паводле слоў сваіх асудзішся» (Евангелле паводле Матвея, 12:35,37).

Словаблудства, брыдкаслоўе, пустаслоўе наносяць непапраўныя страты здароўю, іміджу, аўтарытэту чалавека, прыніжаюць сацыяльны статус асобы. Беднасць мовы, «коснаязыкасць» псуюць нават самую прыгожую знешнасць, выкрываюць ўбоства душы і розуму.

Адсутнасць стрыманасці ў словах, пустыя размовы, ігнараванне правіл моўнага этыкету, элементарная непісьменнасць – усё гэта дрэнна, але самыя страшныя наступствы для чалавака, асабліва для маладой асобы, ды і для грамадства ў цэлым, мае распаўсюджанне брыдкаслоўя. Між тым яшчэ апостал Павел у сваіх пасланнях папярэджваў: «Ніякае брыдкае слова хай не выходзіць з вуснаў вашых» (Пасланне святога апостала Паўла да Эфесянаў, 4:29). «Не ашуквайце саміх сябе: ці не ведаеце, што зламоўныя Царства Божага не спадкуюць» (Першае пасланне святога апостала Паўла да Карынфянаў, 6:10).

Раней пачуць лаянку дзе-небудзь было выключэннем, нават надзвычайнасцю. А зараз збітая і намулелая вушы ненарматыўшчына – у штодзённым жыцці: у сям’і, у транспарце, на вуліцы, на працы. Апошнім часам гэта ганебная з’ява перастала быць выключэннем. Маральнае калецтва – брыдкаслоўе – пагражае неакрэплым душам. Вучоныя лічаць,

што брыдкаслоўе адыгрывае сваю негатыўную ролю ў распаўсюджванні хвароб і агульным пагаршэнні самаадчування чалавека.

У выніку сямнаццацігадовага даследавання групай навукоўцаў пад кіраўніцтвам доктара біялагічных навук І. Бяляўскага было даказана, што ў людзей, якія ўвесь час выкарыстоўваюць мат, меншая працягласць жыцця. Другая група даследчыкаў на чале з кандыдатам біялагічных навук П. Гараевым даказала, што мацерныя словы могуць негатыўна ўздзейнічаць на генетычны апарат чалавека. Вопыты на насенні расліны арабідопсіс прадэманстравалі, што брыдкаслоўе правакуе генныя мутацыі і нават выраджэнне. Адразу ўзгадаваюцца словы прамудрага цара Саламона: «Благаславеннем праведных ўзвышаецца горад, а вуснамі грэшнікаў руйнуецца» (Прытчы Саламонавы, 11:11).

Такім чынам, адмоўна ўздзейнічае мацерная лексіка не толькі на таго, хто ўжывае яе ў сваім маўленні, але і на таго, хто слухае яе. У свой час быў зроблены наступны эксперымент: бралі дзве шклянкі рысу і кожны дзень на працягу месяца гаварылі ім пэўныя словы. Рыс, якому гаварылі «дзякуй», праз месяц меў прыемны пах, а рыс, якому казалі «ты дурань», – пачарнеў і згніў. Яшчэ больш адчувальная да славеснага пасылу вада. Вада, якая ўвабрала злосць і нянавісць, становіцца ядам.

Злое слова – атрута, злое слова – забойца, злое слова – бумеранг. Як паказалі сучасныя даследаванні ў галіне хвалевай генетыкі, генетычны апарат зямных арганізмаў працуе не толькі на рэчыўным, але і на полевым узроўні і здольны перадаваць інфармацыю з дапамогай электрамагнітных і акустычных хваляў. А кожнае слова – гэта пэўная хваля з адпаведнай частатой вагання, якая ўплывае на навакольнае асяроддзе, а таксама і на жывыя істоты. Цяпер зразумела, чаму Хрыстос казаў вучням: «Вы чулі, што сказана продкам: “не забівай, а хто заб’е – падлягае суду”. А я кажу вам, што кожны, хто гневаецца на брата свайго марна, падлягае суду; а хто скажа брату свайму: “рака” (што значыць “пусты чалавек”), падлягае сінедрыёну (найвышэйшае судзілішча); а хто скажа: “неразумны”, падлягае геене вогненнай» (Евангелле паводле Матвея, 5:21–22).

І, наадварот, наколькі магутную гаючую і выратавальную сілу мае малітва, вядома ўсім вернікам. Цікава, што сёння ёсць магчымасць спаслацца і на вынікі канкрэтных навуковых даследаванняў: насенне раслін падверглі апраменьванню ў дзесяць тысяч рэнтген. Святары бласлаўлялі насенне і чыталі над ім малітвы. У выніку навукоўцы зафіксавалі пазітыўныя змены на генетычным узроўні.

Народнае ўяўленне пра важнасць удумлівага стаўлення да таго, што і як гаворыць чалавек, знайшло сваё ўвасабленне ў фальклоры.

У прыватнасці, гэта тэма часта гучыць у беларускіх прыказках і прымаўках: *Як брыдкае слова сказаць – лепш язык выплюнуць*; *Дурнога салаўя – дурныя песні*; *Сліны не падымеш, а слова не выкінеш*; *Выказанага слова да губы не вернеш*; *Рана загоіцца, а злое слова – ніколі*; *Сказаў – як цвіком прабіў.*

Народная творчасць фіксуе не толькі тое, чаго трэба пазбягаць, але і тое, да чаго неабходна імкнуцца: *Ласкавае слоўка, як сонейка,грэе*; *Слова лечыць і калечыць*; *Добрае слова сказаць – посах у рукі даць*.

Сёння мова засмечваецца брыдкімі і гнілымі словамі, жарганізмамі, рознымі слэнгамі, непатрэбнымі запазычваннямі. А гэта можа прывіць падрастаючаму пакаленню рысы нацыянальнага нігілізму, які з развіццём цывілізацыі вядзе грамадства да духоўнага спусташэння, а праз тысячагоддзі – і да самазнішчэння.

Таму мы павінны рабіць немалыя захады, каб новыя пакаленні не выраслі з аслабленым грамадзянскім і патрыятычным імунітэтам, каб адчуванне нацыянальнай разгубленасці, непаўнавартаснасці не вяло моладзь у адных выпадках да духоўнага спусташэння, у другіх – да прагматычнага прыстасаванства.

У пераважнай большасці людзі па сваёй натуры – прыстасаванцы. Здаецца, яны нібы народжаны для падпарадкавання, для згоднага ўспрымання прыродных ці грамадскіх з’яў. Аднак Гасподзь прапануе нам не прыстасоўвацца, а быць суладнымі з Ім, дзейнічаць свабодна, натхнёна, але з улікам аб’ектыўных законаў і заканамернасцяў. Пастаянна Ён падштурхоўвае людзей шукаць суладнасці (як з Ім, так і паміж сабою), узаемапаразумення, каб потым яны змаглі творча выявіць сваю наканаванасць. І такім чынам спраўдзіцца ў сваім зямным існаванні, быць сапраўды «народам Божым», народам святым, народам праведнікам, які ў аснову свайго быцця і сваёй гістарычнай місіі закладвае запаведзі Божыя – фундаментальныя, справядлівыя і мудрыя прынцыпы існавання чалавечай цывілізацыі. І ў гэтай свяшчэннай справе мова – менавіта мова родная – выступае для людзей трывалай духоўна-матэрыяльнай сувяззю.